# КСЕНІЯ ЗАРЭЦКАЯ



## Каралева выпускнога

Апавяданне

Зарэцкая Ксенія нарадзілася 10 лютага 2002 года ў горадзе Кобрыне Брэсцкай вобласці. Скончыла факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. З мастацкай прозай друкавалася ў раённай газеце «Кобрынскі веснік», альманахах «аБДУмана» і «Першацвет», зборніках «Размова з люстэркам» і «Вазьмі сваю свяцільню». Публіцыстычныя і крытычныя артыкулы публікаваліся на старонках часопісаў «Маладосць», «На экранах» і «Бярозка», газет «Культура», «ЛіМ», «Переходный возраст». Працуе рэдактарам. Жыве ў Мінску.

### D-100

Лера была прыгажуняй. Яна пра гэта ведала і не давала забываць нікому. Прыгажосць часткова была падаравана ёй выдатнымі матчынымі генамі, часткова стваралася штодня, праз уліванне ў яе — прыгажосць — велізарнай колькасці часу.

Лера прачыналася ў пяць раніцы кожны дзень. І перш за ўсё — усміхалася. Сама часам думала, што ёсць у гэтым нешта псіхапатычнае: любіць настолькі раннія пад'ёмы, і не перад чымсьці прыемным, не перад падарожжам або святам, а перад звычайным буднім днём. Усе яе аднакласнікі ненавідзелі прыходзіць да першага ўрока — гэта значыць, ненавідзелі роўна пяць дзён з шасці навучальных, але Леры было добра і спакойна ў сваёй руціне.

Спачатку яна зняла з галавы вялікія бігудзі, якія стваралі з непаслухмянай капы залацістых — ніхто і не памятаў, што калісьці яны былі шэрымі і цьмянымі — валасоў ідэальныя локаны, якія трэба было акуратна падзяліць на маленькія кудзеркі, зафіксаваць спачатку мусам для ўкладкі, а потым — лакам. Пасля Лера ўмывалася. Яна прытрымлівалася карэйскага сяміступеньчатага догляду, які складаўся з пенкі, гелю, тоніку, крэму, патчаў, сывараткі і SPF. Працэдура гэтая займала трыццаць хвілін, уключаючы невялікі масаж гуаша, які павінен быў пазбавіць яе ад ацёкаў. Леры не было сумна. Аніразу. Яна разглядала свой твар. Палохалася новых прышчыкаў, якія, нягледзячы на ўсе намаганні касметолага, ніяк не хацелі знікаць ні з ілба, ні са спіны. Разглядала маленькія маршчынкі каля вачэй і на пераноссі. Пакуль яны яе не псавалі, але колькі гадоў спатрэбіцца на тое, каб маршчыны сталі глыбокімі і страшнымі і зрабілі яе непрыгожай? Гэтая думка палохала Леру. Яе наогул палохала любое

выяўленне чалавечых недасканаласцяў. Любое абазначэнне завяршэння чалавечага жыцця палохала яшчэ больш. Але навучаная Скарлет О'Харай, яна адкладала ўсе непрыемныя думкі на заўтра. І так дзень за днём запіхвала старыя і новыя трывогі ўсё глыбей у сваю свядомасць, пакуль ад іх не заставалася нічога, акрамя лёгкіх уколаў у сэрца. Памяркоўных. Не страшных.

Пасля ўсіх працэдур Лера адправілася снедаць. Мама ўжо прачнулася, але гатаваць яна не любіла, выбірала правесці гэты час за стварэннем прычоскі — занадта дробных кудзерак, якія зусім ёй не падыходзілі, на думку Леры. Але яна рана вывучыла, што некаторыя думкі лепш трымаць пры сабе. Каб пазбегнуць непрыемнасцей.

— Добрай раніцы, Лярусік,— мама ўжо паставіла чайнік на электрычную пліту, падрыхтавала турку з кавай. Пліта гэтая Леры не асабліва падабалася, бо на ўключаную фаерку яна магла глядзець доўга-доўга, часам гадзінамі. Яе супакойвалі ўсполахі аранжава-блакітнага полымя. Ёй падабалася падносіць пальцы блізка-блізка, адчуваць жар, ужо пякучы, але яшчэ не балючы, і ў апошні момант, за секунду да сапраўднага апёку, адхопліваць далонь. У гэтым была магія.

— Добрай,— Лера ўсміхнулася і чмокнула маму ў шчаку. Паморшчылася трохі, бо ад той ужо пахла цыгарэтамі і духамі Moschino — занадта салодкімі для дарослай жанчыны. Але меркаванне... Каго цікавіць яе меркаванне?

— Кавы? — таксама маленькі рытуал, сцэнка, якая разыгрываецца з дня ў дзень, незразумела, з якой мэтай. Напэўна, каб ім было пра што размаўляць.

— Я гарбаты вып'ю, дзякуй.

Лера дастала з халадзільніка латок яек і доктарскую каўбасу. Наогул, мяркуючы па фільмах, прыгажуні павінны харчавацца аднымі ёгуртамі і салатамі, але гэта было поўным глупствам, бо на такім рацыёне ў прыгажунь адсыхалі б мазгі. Лера прытрымлівалася версіі: калі чагосьці не бачна, то яго не існуе. І шчодра наліла алей у патэльню. Разбіла туды ж адразу тры яйкі, сыпанула солі, перцу і змяшала. Зверху, арудуючы нажом, шчодра накрышыла каўбасы. Удыхнула прыемны пах.

— Не шкадуеш ты страўнік, Лярусік,— паведаміла мама, нядбайна ставячы кубак з рэшткамі кавы ў ракавіну.

Гэтую заўвагу трэба было пакідаць без увагі. І кубак за мамай памыць таксама. Абавязкі, чорт бы іх пабраў.

Мамчыных збораў чуць не хацелася. Яна звычайна падвывала нейкай папсе па тэлевізары, але ні голасу, ні густу ў музыцы ў яе не мелася. Таму Лера ўсунула ў вушы навушнікі, уключыла мукбанг сваёй улюбёнай карэйскай ютубершы і, паставіўшы патэльню на драўляную падстаўку, прынялася палачкамі ўплятаць яечню. Гучна сёрбаючы, яна прадумвала лук для школы.

Скончыўшы са сняданкам, згрудзіла посуд у ракавіну, уключыла гарачую ваду — настолькі гарачую, што цярпець было практычна немагчыма, але і ў гэтым быў рытуал. Пасля рамонту ў іх стаяла пасудамыечная машына, аднак карыстацца ёй Леры не падабалася. Уборка супакойвала. Адмываючы рэшткі ежы з талерак, адчувала задавальненне. Яна наводзіла парадак, вяртала рэчы да іх зыходнага стану. Амаль паэтычна. Праўда, рукі яе заўсёды былі ў пальчатках — няма чаго псаваць скуру жорсткай вадой і з'едлівымі мыйнымі сродкамі.

Яна насуха выцерла посуд, расставіла яго па месцах. Акінула кухню ўважлівым позіркам, правяраючы, ці не ўпусціла бардак, ці не схавалася ад яе нейкая недасканаласць. Не схавалася. І на вуснах Леры з'явілася маленькая шчаслівая ўсмешка. Наперадзе чакала лепшая частка кожнай раніцы — макіяж.

Бачыць, як яе твар — звычайны, увогуле, з нізкім ілбом, шырока пасаджанымі вачыма, занадта вялікімі для дробных рысаў вуснамі — ператвараецца ў эталон прыгажосці, было жудасна захапляльна. Лера грала з адценнямі танальніку, падбірала скульптураванне, вырашаючы, падсвятліць сёння скулы або спыніцца на мілым вобразе, дадаўшы румян.

# ВІКТОРЫЯ СОН



## Спрачацца са сваёй душой...

Вершы

Сон Вікторыя нарадзілася 18 чэрвеня 2005 года ў Мінску. Скончыла гімназію № 61 г. Мінска. Вучыцца на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Вершы друкаваліся ў газеце «Літаратура і мастацтва», часопісе «Полымя».

### Дом

Аб каву разбіваюцца салёныя аскепкі.
Шуміць на фоне шэры тэлефон.
На белы ламінат кладуць старыя кепкі,
нібы склікаюць на аўкцыён.

Ля халадзільніка стаіць чужая ваза.
На падваконні слоік з-пад гуркоў.
За шэрым шклом ляжаць запалкі
не для газы,
маленькія цвікі для двух кручкоў.

Каля ўвахода — доўгая чарга з абутку,
ды швабра прыкрывае правады.
І дзверы чорныя адчыніць хтосьці хутка,
папросіць поўны кубачак вады.

### У майстэрні

Саладкаваты пах акрылу
змяшаўся з грыфельнай смугой.
Нацёршы рукі свежым мылам,
мастак заходзіць у пакой.

Перастаўляе крэсла спрытна,
з паліцы дастае альбом,
натхнёным пачынае рытмам
ды ўсміхаецца ілбом.

Мяшае ў слоіку алоўкі,
што натачыў ён загадзя,
у іх мурзатыя галоўкі
з адценнем творчага жыцця.

Забыўшыся, ідзе па гумку,
што побач з фарбаю жыве.
Да гумкі, узгадаўшы думку,
малюе зноўку ў галаве.

Зрабіўшы некалькі эскізаў,
па каву ўжо ідзе мастак,
па чорну-чорну, да капрызаў,
бо без яе тварыць ніяк.

Партрэт сустрэнецца з акрылам,
хай паляжыць пакуль ён так.
Зноў націрае рукі мылам
шчаслівы, стомлены мастак.

Фота з архіва В. Сон

# ВІКТАР ШНІП



## Лісты да Міёны

Паэма

Шніп Віктар нарадзіўся 26 сакавіка 1960 года ў вёсцы Пугачы Валожынскага раёна. Скончыў Мінскі архітэктурна-будаўнічы тэхнікум і Вышэйшыя літаратурныя курсы Літаратурнага інстытута імя А. М. Горкага ў Маскве. Працаваў у часопісе «Беларусь», у газеце «Наша слова». З 1995 па 2004 год быў намеснікам галоўнага рэдактара і галоўным рэдактарам штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва».
Цяпер — намеснік дырэктара выдавецтва «Мастацкая літаратура» — галоўны рэдактар часопіса «Полымя». Аўтар многіх кніг паэзіі і прозы. Лаўрэат прэміі імя Уладзіміра Маякоўскага (1987), літаратурнай прэміі «Залаты Купідон» (2007), спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у намінацыі «Мастацкая літаратура» (2008), Нацыянальнай літаратурнай прэміі (2021), літаратурнай прэміі імя Максіма Танка (2023) і інш.

Памяці аўчаркі Міёны
(17.08.2015—3.07.2024)

✦ ✦ ✦

Пішу табе, як сто гадоў таму
Свае лісты пісаў сабаку Пушча.
Наперадзе зіма, і мне ў зіму
Ісці ўжо аднаму, і ў вецер злюшчы

У слёзах твар у шапку не хаваць,
Глядзець наперад, і шукаць сцяжыну
У новы дзень, дзе дрэвы прашумяць
Пра ўсё, што я аднойчы тут пакіну,

Дзе мы з табой як родныя жылі
І верылі, што будзе ўсё як трэба.
Нішто не вечна, знаю, на зямлі,
Адно магчыма — дасць нам вечнасць неба.

Сяброў з маленства больш няма даўно.
Ляжаць па свеце ў травах, пад крыжамі.
Адных згубіла таннае віно,
А іншыя сябе згубілі самі.

Былі, няма, нібы і не было.
Але зусім не плачу я пра гэта.
На дрэвах не лістота, а святло
Крыві і вершаў ненароджаных паэтаў.

Я вельмі мала гаварыў з табой.
Я думаў, нагаворымся зімою,
Калі ўладарыць холад за сцяной,
А ў доме ўсё спавіта цеплынёю.

Цяпер адной табе лісты пішу.
І веру я, што іх ты прачытаеш.
У неба паніжэлае гляджу.
Адказ дасі, як там мяне спаткаеш...

# ТАЦЦЯНА ДАШКЕВІЧ



## Вока

Аповесць

Дашкевіч Таццяна нарадзілася 1 верасня 1968 года ў пасёлку Азярышча (цяпер — Мінск) Мінскага раёна. Скончыла Літаратурны інстытут імя А. М. Горкага, семінар Льва Ашаніна. Паэт, празаік, перакладчык, публіцыст. Аўтар шэрагу кніг для дзяцей і дарослых. Лаўрэат многіх рэспубліканскіх і міжнародных літаратурных прэмій і конкурсаў. Жыве ў вёсцы Валяр'янава Мінскага раёна.

### Святая зямля Ананан

Усе людзі — эмігранты. Кожны пакідае краіну свайго дзяцінства, нібыта з маленькага намёта выбіраецца ў хмарачос. Але сёння мне здаецца, што намёт, пабудаваны ў дзяцінстве, быў больш надзейны за цяперашні маналітны дом з пастаяннай рэгістрацыяй. А ідэалы і арыенціры — калі ёсць у дзяцінстве, вядома, ідэалы і арыенціры — былі больш дакладнымі і сумленнымі. Маё пакаленне пакінула краіну, у якой нарадзілася, не па сваёй ахвоце. Хутчэй, краіна пакінула нас. Але яна захавалася ў памяці не піянерскімі заклікамі, а кропелькай расы на травінцы, валошкай у жыце, яскравым матыльком у зялёнай траве. Ці хлопчыкам, пра якога вось і расказаць няма чаго. Таму што ёсць іншыя краіны і народы, не геаграфічныя, іх не адшукаеш на мапах і атласах. Напрыклад, зямля Ананан з казкі маёй бабулі. Я веру, што Ананан існуе. У дзяцей усё па-іншаму, яны думаюць іншымі катэгорыямі. Ім належаць не краіны — сусветы!

Я раскажу вам пра незвычайнага хлопчыка-малечу, які жыў на маёй радзіме — у маім дзяцінстве.

Згадваю хлопчыка, што бяжыць па высокай траве і са шчаслівым смехам выпускае з бруднай далонькі ластаўку ў неба. Мне, пяцігадовай, тады ўжо дазволілі выходзіць за межы двара адной, і я аднойчы ўбачыла хлопчыка, які стаяў па калена ў кучы пяску.

— Як цябе завуць? — спытала і зайшла ў яго ўладанні па шчыкалатку.

— Вока,— адказаў хлопчык і тыцнуў у мяне пальцам.— Ты?

— Лёля.— Я ўвайшла ў гарачую гару па калена, як ён.

— Ла,— паўтарыў ён і весела падкінуў уверх пясок. Я не разумела, што хлопчык гэты — не такі, як усе. Яшчэ не ведала, што бываюць людзі «не такія». І пачала

рабіць, як ён,— кідаць пясочак угору. Мая белая ў сіні гарошак сукеначка атрымала выпрабаванне пясочным дажджом. А потым пайшоў дождж сапраўдны, вадзяны, востры, сонечны, колкі: дажджынкі — як залатыя пясчынкі. Я была ўпэўнена, што хлопчык неяк звязаны з гэтым. Начараваў? Проста ён захацеў піць — і пайшоў дождж. Вока піў святло дажджу, закідваючы галаву, і я рабіла тое самае.

Наступнай раніцай я ўбачыла Воку на сцяжынцы, што вяла ў лесапаласу, вылезла ў акно і пайшла па слядах яго босых ног. Ён бег так хутка, што за ім цяжка было паспець, і нарэшце знік з маіх вачэй. Цэлы дзень да позняга летняга вечара я блукала па лесе босая, а потым села на пянчук і зарумзала. Доўга я чакала падмогі, зайшлася плачам да дрыжыкаў... Страшна было памерці на гэтым пенчуку і ніколі не ўбачыць маму і тату. А страшней за ўсё было тое, што бацькі вылаюць бабулю. «Лёлю з'елі ваўкі, толькі ты і вінаватая: гэта ты яе адпусціла! Нельга нават у камандзіроўку паехаць!» — будзе крычаць тата, а мама — плакаць. І мяне не радавалі ні муравейнік, што спяваў карычневай ручаінкай непадалёк, ні званочак, які ў прыцемку лесу звінеў сярод папараці малюсенькім песцікам аб разьблёны паўпразрысты купал. Мой звычайна абвостраны слых нічога не ўспрымаў і не ўяўляў. У мяне свярбелі ступні, мерзла спіна і ныла і пераварочвалася нешта ў жываце. І раптам я пачула, як перабежкамі падкрадваецца на мяккіх лапках воўк ці рысь, а можа, і мядзведзь, каб з'есці мяне разам з распаленымі пяткамі і закладзеным носам, і я гаротна загаласіла што ёсць моцы. Драпежнік ператварыўся ў Воку, бруднага, падрапанага.

— Ла! — Ён працягнуў мне жменьку памятых суніц, узяў за руку і павёў з лесу з хуткасцю сонца, якое сплывала за гарызонт. Я машынальна ела суніцы, саланаватыя ад слёз, і баялася адпусціць яго вільготную гарачую далоньку. Думала: адпушчу — і правалюся ў глухі свет цёмнага лесу, у яго імхі і берлагі, і гэта будзе ўжо назаўсёды.

Бабуля пасвяціла ў твар газоўкай — у пасёлку ў той вечар знікла электрычнасць — і нават не сварылася на мяне, няшчасную. Воку дала сушку і, праводзячы, пацалавала яго ва ўскалмачаныя валасы. А мяне — вымыла ў цынкавай балейцы карычневым дзягцярным мылам і паклала ў чыстую пасцель. Белы кот Сняжок казытаў мае шчокі вусамі і прахалодна дыхаў праз ружовыя малюсенькія ноздры, потым — улёгся побач на маю падушку.

— Там за востравам Буянам, там за морам-акіянам ёсць зямля святая Ананан,— баяла мне сваю вечную казку бабуля. Іншых яна, падобна на тое, не памятала, але і гэтай мне хапала.— А на зямлі гэнай стаіць дрэва вялікае-найвялікае. А пад дрэвам сядзіць бабуля старэнькая-найстарэнькая і гушкае яна зайчыка маленькага-наймаленькага...

У тую ноч зайчык быў з абліччам Вокі, а бабуля... Яна заўсёды была сабой, Бабуляй.

## Бабуля

Бабуля ішла наперадзе па дарожцы і тлумачыла:

— Глядзі, гэта — кабылкі. Іх трэба чысціць, а пад скуркай — малако. Потым — вымочваць. Вось вазьмі. Бачыш — малачко? Кабылкі... Гэта — ваўнянкі. Ружовенькія. Запомні... І таксама ёсць пад скуркай малачко... Ой, навошта ж ты ліжаш? Горка ж! Гэта не тое малачко, што мы ў Фёдараўны бяром, гэта грыбное, жудасць якое горкае! Ну не плач, мая маленькая!

Сняжок ідзе з намі, ён такое малако не любіць, праверана. У роце ў мяне гаркота, бабуліна далонь шурпата гладзіць па шчацэ, фартух пахне травой... чаборам... сенам... мятай... палыном... бабуляй.

— Бабуля! Чаму яны так? А ўдавалі з сябе ружовых, добрых... Яны мне так спадабаліся! Яны павінны быць смачнымі! Чаму такія горкія?

— Ой, дзіцятка маё... Яны больш не будуць! Вось вымачым, пасмажым — і будуць смачнымі! Я табе гэта абяцаю. Ты мне верыш?

Ківаю, размазваючы слёзы па шчоках.

— А дапаможаш? Чысціць грыбы дапаможаш бабулі старой?

ІНТЭРВ'Ю

# ІВАН МІСКО

## Сонца хутарскіх яблыкаў

Майстэрня народнага мастака Беларусі Івана Якімавіча Міско даўно стала музеем, філіялам музея горада Мінска, а яе гаспадар часта жартам называе сябе галоўным экспанатам. Але атмасфера тут зусім не нагадвае ціхія музейныя залы — у сценах старажытнага будынка віруе жыццё. І не толькі таму, што прыходзяць экскурсіі, якія праводзіць сам Іван Якімавіч, але і таму, што тут утварыўся сапраўдны клуб творчай інтэлігенцыі. Усім вядома, што Івана Міско называюць касмічным скульптарам. Космас — яго любімая тэма, ён аўтар партрэтаў многіх касманаўтаў, ад Юрыя Гагарына і Пятра Клімука да Алега Навіцкага і Марыны Васілеўскай. Тут перабывалі касманаўты з усяго свету, пра што сведчаць іх аўтографы на люстэрку, на сцяне, на дзвярах, ператвораных у мемарыяльную дошку... Але тут бывалі і бываюць яшчэ і вядомыя кампазітары, артысты, пісьменнікі, спевакі, а таксама навукоўцы, дыпламаты, грамадскія дзеячы... Таму размовы атрымліваюцца цікавыя, насычаныя, напоўненыя ўнікальнымі фактамі. Гаспадар і сам можа распавесці цікавостак на цэлую кнігу... Аднойчы размова пачалася з таго, што Іван Якімавіч падчас нядаўняй творчай паездкі — ён жа ўваходзіць у розныя камісіі і мастацкія рады — згубіў свой тэлефон. Давялося наноў наладжваць сувязі...



Іван Міско са сваёй маскай

### Пра хутар, антонаўкі і сонца

— Як мы залежым ад тэлефонаў...— наракаў майстар.— Раней — паехаў на млын, два дні там жывеш, пакуль мука мелецца, і ніякай сувязі... Бацька мой так ездзіў, мы яго чакалі. І абавязкова, як вяртаецца назад, трэба ў муцэ выпацкаць рукі, шапку, вопратку. Каб бачылі: еду з млына!

***— Паказаць сваю заможнасць?***

— Так... Але гэтую сёлетнюю муку трэба было захаваць. Калі з новага ўраджаю выпякалі хлеб, усе ў вёсцы гаварылі: «Сёння Якім частаваў маладым хлебам! Дык гэта ж лодар! Вось у мяне ёсць старая мука, дык яе яшчэ да новага году хопіць!» Значыць, ураджай у цябе быў благі, ты бедны. А як сала правяралі... У нас дома была старая белая польская кафля. Кабана заколюць, і сала кусок прыкладваюць да кафлі: шырыня пліткі была меркай. Калі па таўшчыні супала — добры гаспадар. І галоўнае, каб у сале мяса не было. Інакш

дрэнны гаспадар, кепска свінню карміў. Такія вясковыя звычаі, ад якіх не сысці. Яшчэ хутар памятаецца антонаўкай. Як у нас на хутары з'явілася першая яблыня — не ведаю... Яблыкі былі кіслыя, іх рвалі толькі позняй восенню. І маці гэтыя яблыкі клала ў кішэні адзежы. Шафаў у нас не мелася, складвала ўсё на зіму ў куфар, а вясной даставала. Ніводны яблык не згніў. А ўся адзежа была насычаная водарам саду, водарам яблык — па тых часах жа парфумы не было, ніякіх адэкалонаў. Самае лепшае, што мелі,— водар яблык. А яшчэ ніжнюю бялізну, даматканую, памыюць і павесяць на марозе. У дом неслі — яна як кол, аж ламалася. Павісіць некалькі дзён у доме, адтае, высахне... Але які быў водар снегу, марозу ад тае бялізны! Тады і мыла не мелася — у попеле варылі бялізну.

***— Вы жылі ў Заходняй Беларусі, памятаеце 1939-ы і дзень уз'яднання?***

— Добра памятаю. Бацька сказаў: «Дзеці, ідзіце ў панскі сад, бо паноў тут больш няма, ірвіце яблыкі антонаўкі і насіце на дарогу салдатам». А там чырвоная конніца, і машыны, і танкеткі ішлі са Слоніма на Гродна... І мы рвалі яблыкі і ў кошыках насілі на дарогу. Гэта было такое пачуццё радасці, задавальнення. Салдаты нас печывам частавалі. Яркая карціна ў памяці... Летам, калі наведаў радзіму, пайшоў у тое Грыбава, дзе быў стары панскі сад, хацеў знайсці антонаўку, але ўсе дрэвы ўжо аджылі. Хацеў на лецішчы ў сябе прышчэпку зрабіць. Знайшоў жывую яблыню ля свайго дома, дзе дзед мой яшчэ прышчэпку рабіў. Так што на лецішчы ў мяне ёсць цяпер дзедаўскі яблык — белая гранёная антонаўка. Чаму на хутары захавалася тая яблыня? Бо дзед выкопваў дзічкі ў лесе, прыносіў дамоў, саджаў і на наступны год рабіў на ёй прышчэпку. І гэтая дзічка восемдзесят гадоў расце і не хварэе. Бо як дзічка апынулася ў лесе? Семачка прайшла праз страўнік дзіка ці лася. Тады і слова «дзічка» не было — казалі «высранка». Я аднаму паэту гэта сказаў — ён мне: «Іван, гэта не літаратурнае слова, але вельмі ёмкае». Многа такіх дэталяў помніцца... Хутарское дзяцінства. Хто цябе мог там выхоўваць? Само асяроддзе. Усход сонца... Я настолькі быў захоплены ім, што можна было падумаць — ненармальны дзіцёнак. Мне так хацелася паглядзець, адкуль яно ўзыходзіць і чаму хаваецца. Мне здавалася, яно жывое і са мной гуляе. Раніцай пайшоў за лес, гляджу — там і далей ёсць лес. Праз дзень і туды адправіўся... А не спытаеш жа ў бацькоў, скажуць — ненармальны. А мяне ўсё цікавіла...

***— Быў хутар, але побач і вёска... Вялікая?***

— Чэмеры, вялізная вёска! Як дружна жылі! Падчас фашысцкай акупацыі да вечара мы ўжо ведалі, што нас заўтра чакае — нехта перадаваў: «Дома не начуйце, будзе карны атрад, спаляць вёску, расстраляюць... Бярыце коўдру, вопратку, начуйце ў лесе». Мы так і рабілі. Хто той добры чалавек, які папярэджваў нас? Па сёння не ведаем. 1939 год... Успамінаю, якая была барацьба за мяжу. Судзіліся, бойкі ўчынялі, калі мяжу нехта пераараў на тры-чатыры сантыметры ў свой бок. Нацягвалі дрот, перамервалі... Якая ішла барацьба за зямлю... Мая маці выйшла замуж дзякуючы таму, што яе бацька падарыў ёй гектар зямлі. А ў майго дзеда было чацвёра дзяцей. Усе яны засталіся непісьменныя, але выжылі... Калі адбылося ўз'яднанне з Усходняй Беларуссю, арганізавалі калгас, прывезлі ў вёску трактар. Вялікія колы, з шыпамі... І бацька мой сказаў: «Прыехаў у калгас жалезны конь». І гэты конь два дні паараў, паараў, залез у гліну — і заграз. Прывялі дзве кабылкі, зачапілі за гэты трактар і выцягнулі. Бацька мой пасля сказаў пра таго жалезнага каня: «Не тым аўсом кармілі».

***— Ці захаваўся сёння ваш хутар?***

— Захаваўся. Але ў доме жывуць іншыя людзі... Маці яшчэ пры жыцці прадала яго пад лецішча. Калі фільм пра мяне здымалі, выратшылі і туды паехаць. Прыехалі... Дзень прабылі там. Я, вядома, змерз, у

дом жа не ўвойдзеш... Вакол пустыя дамы. І сабака нідзе не гаўкнуў, і кошка дарогу не перабегла... Певень не пракукарэкаў. І ніводнага з жывых аднавяскоўцаў не ўбачыў. Вакол палі, дзе бацька мой араў, зараслі лесам. Падышоў я да дому, пастукаў у вакенца, пусціў слязу... Страшна стала. Як усё сышло... Гісторыю трэба паказваць... Вось стары драўляны дом. Трэшчыны на зрубе. Я іх разглядаю, як зморшчыны чалавека. Люблю гэтыя расколіны.

***— А з дрэвам вы працавалі?***

— Працаваў. Вось зараз да яго вярнуўся. Накідаў эскіз, называецца «Усход сонца». Малюнак будуць утвараць трэшчыны. Хачу звязаць з тэмай іншапланецян. Не магу ад яе адмовіцца. Што за зямной арбітай? Ніхто сказаць не можа. Бясконцасць. Нават людзі мяняюцца ў залежнасці ад таго, дзе жывуць. У горца асаблівая форма носа, таму што ён дыхае іначай, бо паветра іншае. Вузкія ці вялікія вочы — таксама ад кліматычных умоў залежыць.

## Пра тыпажы і творчую зайздрасць

***— І вось вы глядзіце на чалавека і можаце ўсё распавесці па форме яго твару?***

— Часам нават па форме пяткі. Ідзе чалавек, я ў думках яго распранаю, як рэнтгенам. Думаю, можна ляпіць яго аголеным ці нельга. Ляпіць вельмі прыгожых складана. Правільныя прапорцыі, а за што зачапіцца? Гэта як у тэатры — трэба тыпаж. Успамінаю піцерскага акцёра Рамана Філіпава. Страшэнна непрыгожы. Выходзіць на сцэну, яшчэ нічога не сказаў — усе погляды на яго. Тыпаж. Герой. Памятаю, у маладосці хадзілі ў тэатр на нейкага канкрэтнага артыста. Складана гэта — знайсці тыпаж. Аляксей Канстанцінавіч Глебаў выразаў з дрэва партрэт Францыска Скарыны, і па сённяшні ніхто лепей не зрабіў. Цяпер усе ўяўляюць Скарыну такім. Аднойчы ад ГУМа я ішоў у мастацкі музей. Было лета. Гарачы, сонечны дзень. І насустрач у натоўпе ідзе жанчына. Я чамусьці толькі яе і заўважыў. Замёр, стаў... Падышла бліжэй, і аказалася, гэта манашка. Як яна несла сябе! Тое ўражанне дасюль памятаю. Мастак, журналіст, пісьменнік заўсёды павінен быць у працы, хапаць уражанні. Колькі я ездзіў у цягніку з Янкам Брылём — ён сядзіць, размаўляе са спадарожнікамі, пасля раз — дастае маленькі такі нататнічак, нешта запісаў, зноў у кішэню паклаў. Праходзіць дваццаць хвілін — зноў дастаў, зноў запісаў. З Ігарам Лучанком колькі мы ездзілі на рыбалку — яму тая рыба не трэба была. Закасаў штаны, узяў аркуш паперы, залез у нейкія кусты, дзе сонца няма, бруд, і нешта ўсё піша, піша... Таму што ў яго галава запоўненая мелодыяй. А будзе юшка, не будзе — яму ўсё адно.

***— А здараюцца памылкі, калі тыпаж ужо ўвасоблены ў матэрыяле?***

— Гаварыць пра помнік трэба не тады, калі ён пастаўлены ў бронзе, калі не пераробіш ужо нічога. Трэба гаварыць, калі ён яшчэ ў мяккім матэрыяле. Азгур хітры быў: калі прасілі выказацца пра нечую скульптуру, казаў: «Вось гэты лацкан трохі лявей, вось гэты гузік трошкі шчыльней». Нібыта і заўвагу зрабіў, і нічога істотнага, каб пакрыўдзіць. Аднойчы, яшчэ ў Савецкім Саюзе, паехаў я ў Маскву, таму што тады ў Мінску не было ліцеек сваіх. Меліся толькі ў Піцеры і ў Маскве. У Маскве адлівалася праца «Сустрэча Леніна на Фінляндскім вакзале» Аляксея Глебава. Прыехаў я прымаць гатовую працу, яна ўжо адлітая ў алюмініі. І бачу ў кампазіцыі салдата, рука якога прывараная задам наперад. Гэта ж якім п'яным трэба быць, каб прыварыць руку ў другі бок? Я кажу работнікам: «Рука не ў той бок!» — «Быць таго не можа...» І пры мне яны руку адрэзалі і прыварылі іншым бокам.

***— А не перарабілі б, атрымалася б такая арыгінальная скульптура, эксперыментальная, у гісторыю ўвайшла б...***

З АРХІВАЎ

# УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ

## Здарэнне з класікай

### Апавяданне-даследаванне аб жаху

*У 2025 годзе спаўняецца 95 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Караткевіча. І чым далей у гісторыю адыходзіць яго чалавечая існасць, тым больш яскрава высвечваецца ён як Асоба і Пісьменнік, ніяк не змяншаецца цікавасць да яго жыцця і творчасці. А прайшло ўсяго 40 гадоў без яго… Будзе ж і сто, і дзвесце…*

*У архівах, у прыватных асоб знаходзяцца новыя тэксты, напісаныя яго рукой, многае, на жаль, пакуль застаецца ў недасягальнасці. Гэта і лісты, і дароўныя надпісы, раскіданыя сёння па розных кутках не толькі Беларусі, але і іншых краін. Так што знойдзецца праца новым пакаленням даследчыкаў.*

*Прапануем чытачам «Маладосці» няскончаны твор У. Караткевіча «Здарэнне з класікай» з аўтарскім жанравым вызначэннем «Апавяданне-даследаванне аб жаху». Друкуецца ўпершыню паводле рукапісу, які захоўваецца ў аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі.*

*Апавяданне шмат у чым мае аўтабіяграфічную аснову. Васіль Стасевіч згадвае Гаршыцу (раку Аршыцу), Гарань (Барань), Маскву ўвосень 1941 года, Урал і дзіцячы дом… Пазнаюцца сваякі Уладзіміра Караткевіча, напрыклад, Вольга, жонка старэйшага брата, закатаваная фашыстамі, цётка Вольга Садавая, спасылка на смерць якой дае магчымасць датаваць апавяданне 1971—1972 гадамі. Акрамя таго, Васілька Стасевіч — гэта і галоўны герой аповесці «Лісце каштанаў», самага аўтабіяграфічнага твора, як прызнаваўся сам У. Караткевіч.*

*Чым магло закончыцца апавяданне Караткевіча? Спадзяемся, не смерцю Васіля Стасевіча… Магчыма, томік Коласавых паэм, які ён запхнуў сабе за пояс, засцярог ад кулі? Усё можа быць. А ў чытача, без сумнення, знойдуцца свае варыянты…*

*Пятро Жаўняровіч*

Пачнецца не з класікі. Пачнецца з такога «класічнага» свінства, як чалавечы жах. Здарэнне з класікай адбылося пазней. Але яно цалкам выплывала з перажытага мною да таго, і яно будзе цалкам незразумелае без досыць-такі доўгай і, мабыць, досыць нуднай прадмовы.

Ці думаў хто-небудзь, што такое анатомія жаху? Не таго, які кожны з нас адчувае — і не можа не адчуваць,— выкруціўшыся з-пад колаў машыны або з-пад сухастоіны, што падае акурат на цябе, а жаху, абумоўленага куды больш важлівымі, не толькі фізічнымі, але і псіхічнымі, духоўнымі, часам нават сацыяльнымі прычынамі.

Тымі выпадкамі, калі ад цябе, як ад асобы, вельмі мала залежыць.

Мне давялося паспытаць такога пострашу, калі аж валасы дыбарам, калі аж мароз па скуры й спіне прадзірае, калі аж мурашкі па ўсіх месцах,— некалькі разоў у маім жыцці.

Я не кажу пра жах першабытны, пра нялюдскую жудасць, якая незразумелая табе, але, пры пэўных абставінах, можа азначаць для цябе нават смерць. Неадкладную. Не кажу і пра трапятанне за істоту, якую любіш, пра боязь перад застрашлівым, непазбежным яе сконам.

Гэта ўсё натуральна — пляваць! зусім не натуральна! — але ўсе мы людзі, усе чалавекі.

Я кажу аб пякельнай жудзе перад непазбежным сконам, перад смерцю, калі ты не толькі ведаеш, дзе, адкуль і ад каго яна. Калі ты стаіш з ёю твар у твар, ведаеш, што ратунку няма, глядзіш ёй вочы ў вочы і плюеш ёй у вочы хіба што аднымі